А. Агееў

# ПАЧАТАК ЖАНОЧАЙ ЭМАНСІПАЦЫІ Ў ГІСТОРЫІ МАГІЛЁЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА імя А.А. КУЛЯШОВА

Сёлета Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя. А.А. Куляшова адзначае 90 год ад пачатку сваёй гісторыі. [1, с. 86, 87] Наша навучальная ўстанова разам з сваёй краінай перажыла ўсе катаклізмы XX і ўступіла ў XXI стагоддзе. На яе прыкладзе добра бачна як пачыналася жаночая эмансіпацыя ў сферы адукацыі.

Магілёўскі настаўніцкі інстытут, ад якога вядзе радавод МДУ імя А. А.Куляшова, быў адкрыты ў 1913 г. Магілёў стаў 27-32-м горадам Расійскай імперыі, які меў настаўніцкі інстытут. Яго першым дырэктарам быў прызначаны стацкі саветнік кандыдат багаслоўя Уладзімір Мікалаевіч Тычынін, які энэргічна пачаў фарміраваць штат інстытута. Асабовы склад служачых у 1913 г. складаў 14 чалавек. З дзевяці выкладчыкаў шэсць мелі вышэйшую адукацыю. Усе яны былі мужчынамі. [2, с. 59] Такая карціна была тыповай для Расіі тых часоў. Гэта тлумачылася нізкім узроўнем адукацыі жанчын у параўнанні з мужчынамі і практычнай недасягальнасцю для большасці жанчын вышэйшай адукацыі, традыцыямі і заканадаўчымі абмежаваннямі.

Дзейнасць Магілёўскага настаўніцкага інстытута была заснавана на Палажэнні аб настаўніцкіх інстытутах 1872 г., правілах Маскоўскага і Віцебскага інстытутаў 1911 г. Інстытут рыхтаваў настаўнікаў для вышэйшых пачатковых



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

вучылішчаў. У яго прымаліся асобы толькі мужчынскага полу праваслаўнага веравызнання ад 16 да 25 гадоў. [2, с. 60] Таму магчымасці для паступлення ў інстытут жанчын не існавала.

Праўда, у інстытуце яшчэ праводзіліся экзамены на званне настаўніка вышэйшага пачатковага вучылішча для асоб з іншымі формамі адукацыі. Жанчыны таго часу карысталіся гэтай мажлівасцю. У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі захаваліся дакументы на атрыманне кваліфікацыі настаўніцы вышэйшага пачатковага вучылішча Марыі Цімафееўны Шастаковай. Дачцы фельчара для дасягнення сваёй мэты прыйшлося напісаць прашэнне, аплаціць у студзені 1915 г. 10 руб. (немалыя па тым часе грошы!) за будучы экзамен і прадаставіць неабходныя дакументы, сярод якіх канспекты ўрокаў, сведчанні ад губернатара і паліцыі аб яе маральнай і палітычнай дабранадзейнасці і інш. [3, с. 1-25] Падобным шляхам ішлі, відаць, і іншыя жанчыны таго часу. Але сапраўдная эмансіпацыя пачалася ў 1917 г.

Рэвалюцыя 1917 г. прывяла да вялізарных пераўтварэнняў у грамадстве. Часовы ўрад ужо летам 1917 г. дазволіў прымаць у настаўніцкія інстытуты ліц абоега полу. Не абыйшло рэфармаванне і сферу адукацыі. Магілёўскі настаўніцкі інстытут напрыканцы 1918 г. быў пераўтвораны ў педагагічны, у 1919 г. – у інстытут народнай адукацыі, а ў 1921 - практычны інстытут народнай адукацыі Гэтае палажэнне замацаваў і дэкрэт СНК РСФСР ад 2 жніўня 1918 г., у адпаведнасці з якім у вышэйшыя навучальныя ўстановы магла паступаць “кожная асоба, незалежна ад грамадзянства і пола...” [4, с. 403]. Змены ў заканадаўстве шырока адкрылі дзверы ВНУ для жанчын, якім яны адразу сталі масава карыстацца. На мяжы 1922 – 1923 гадоў у інстытуце навучалася 227 студэнта, з іх 112 – 49,3% дзяўчынак [6, л. 1-6]. Такім чынам за чатыры гады жанчыны змаглі ціха і мірна адваяваць сваю нішу і складалі практычна палову студэнтаў Магілёўскай вышэйшай педагагічнай установы.

Стварэнне калектыва выкладчыкаў, які адпавядаў бы статусу ВНУ было адной з самых цяжкавырашальных праблем жыцця інстытута таго часу. У пачатку 1921 г. у штаце было 58 супрацоўнікаў, сярод іх 35 выкладчыкаў, з якіх 31 меў вышэйшую адукацыю або выраўнаваную да яе. У інстытуце працавала 17 жанчын, што складала 29,3% ад агульнай колькасці супрацоўнікаў [5, л. 22-23]. Як бачам, ураўнаванне у правах мужчын і жанчын адразу адчыніла дзверы для апошніх у гэтай сферы дзейнасці.

Большасць жанчын працавала на шэраговых пасадах: тры – тэхнічнымі служачымі, дзве – памочніцамі бібліятэкара, дзве – кур’ерамі, адна – машыністкай, адна лабаранткай, адна – памочніцай справавода. Зубным урачом працавала Зеньковіч Разалія Рыгораўна. Жанчыны складалі палову (11 з 22-х) тэхнічных работнікаў. Узняцца адразу па іерархіі выкладчыцкай, або адміністрацыйнай лесвіцы жанчынам, асабліва з улікам адсутнасці ў большасці супрацоўніц інстытута вышэйшай адукацыі, было нялёгка. Тым не менш 5 жанчын ужо працавалі выкладчыцамі, што складала 14,3% ад іх агульнага ліку выкладчыкаў.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Па праву першых назавём іх імёны і адукацыю:

- Акімава В.І. – вышэйшыя жаночыя курсы Лесгафта ў Петраградзе;
- Арлова Антаніна Іванаўна – петраградскія жаночыя курсы;
- Бер Кацярына Мікалаеўна – вучылася ў сярэдняй школе;
- Залеская Соф'я Львоўна – ВНУ
- Карагодзіна Вера Іванаўна – двухгадзічныя курсы пры Харкаўскім інстытуце. [5, л. 22-23.]

Першую адміністрацыйную кар'еру ў гісторыі МДУ зрабіла, па тых дакументах, што маюцца ў нас на сённяшні дзень, Арлова Ларыса Васільеўна. У свой час яна скончыла курс сярэдняй школы, вышэйшыя курсы Лехвіцкай Скален і вышэйшыя Сцебуцёўскія сельскагаспадарчыя курсы. Таму невыпадкова, калі ў пачатку 1921 г. Савет інстытута абмяркоўваў пытанне аб стварэнні навучальна-узорнай гаспадаркі ў в. Красніца Вендржскай валасці Магілёўскага павета, то Л.В. Арлову адзінагалосна абралі загадчыцай узорна-паказальнай фермы, якой яна з вялікім поспехам кіравала. [5, л. 29]

Жанчыны інстытута ўвесь час актыўна ўдзельнічалі ў яго працы, выбіраліся ў шматлікія камісіі і камітэты. С.Л. Залеская і В.І. Карагодзіна працяглы час уваходзілі ў склад Савета інстытута, які і кіраваў дзейнасцю ўстановы [5]

Вынікі дзейнасці нашай установы ў 1913 – 1923 гг. паказаў, што як толькі былі разблакіраваны мажлівасці самарэалізацыі жанчын, як яны актыўна пачалі занімацца грамадскай, сацыяльнай, адукацыйнай дзейнасцю ў новых для сябе сферах. Мужчыны пачынаюць пасоўвацца са звыклых пазіцый. Але гэты працэс цяжка назваць выцясненнем мужчын. Хутчэй жанчыны пачынаюць займаць сваё законнае месца.

**Літаратура:**

1. Агееў А.Р. Аб датах заснавання педінстытута і спробах адкрыцця універсітэта ў г. Магілёве // V абласныя Магілёўскія краязнаўчыя чытанні. – Магілёў, 1994.

2. Агееў А.Р. Да гісторыі адкрыцця настаўніцкага інстытута ў Магілёве // Магілёўшчына. VII вып. – Магілёў, 1997.

3. НГАБ. – ф. 2258, воп. 1. спр. 33.

4. Народное образование в СССР. Образовательная школа. Сб. док. 1917 – 1973 гг. – М., 1974.

5. ДА Гомельская вобласци. – ф.60. воп. 1, спр. 970.

6. Там жа. – спр. 1010.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова